**19.** Разгледзьце малюнкі.

1)  2)  3)  4)  5) 

Суаднясціце малюнкі з назвамі:

*а) елка; б) аловак; в) дзьмухавец; г) ёлка; д) птушка.*

**А)** 1-а, 2-б, 3-в, 4-г, 5-д. **Б)** 1-б, 2-в, 3-г, 4-д, 5-а.
**В)** 1-в, 2-г, 3-д, 4-а, 5-б. **Г)** 1-г, 2-д, 3-а, 4-б, 5-в.
**Д)** 1-д, 2-а, 3-б, 4-в, 5-г.

---

**20.** Што варыла сарока-варона ў народнай пацешцы?

*Сарока-варона*
*Дзеткам … варыла,*
*На прыпечку студзіла.*

**А)** булён. **Б)** кашку. **В)** кісель. **Г)** бульбу. **Д)** кампот.

---

**21.** Якой літары няма ў беларускім алфавіце?

**А)** ь. **Б)** ў. **В)** щ. **Г)** ш. **Д)** ч.

---

**22.** Дадзены пачатак народнага выслоўя: *Хто чужога не шануе… .* А якая канцоўка выслоўя?

**А)** а свой розум май. **Б)** пазнаецца ў бядзе. **В)** той свайго не мае.
**Г)** мазоль за руку. **Д)** як салавей без песні.

---

**23.** Жаўна – гэта … .

**А)** машына. **Б)** самалёт. **В)** птушка. **Г)** насякомае. **Д)** страва.

---

**24.** У некаторых народных казках выкарыстоўваецца выраз: *“Вам казка, а мне абаранкаў вязка!”* Чым з’яўляецца гэты выраз?

**А)** зачынам. **Б)** самым напружаным момантам.
**В)** паўторам дзеяння. **Г)** канцоўкай.
**Д)** характарыстыкай герояў.

---

КОНКУРС

Арганізатар гульні-конкурсу «Буслік» –
Грамадскае аб’яднанне «Беларуская асацыяцыя «Конкурс»

220045, г. Мінск, вул. Яна Чачота, 16 тэл. (017) 375 66 17, 375 36 23
e-mail: info@bakonkurs.by https://bakonkurs.by/ https://конкурс.бел/

Унітарнае прадпрыемства «Выдавецкі цэнтр БА «Конкурс». Заказ 1. Тыраж 5000 экз. 2023 г.

# Конкурс па беларускай мове і літаратуры «БУСЛІК-2023»

*Чацвер, 16 лютага 2023 года*

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 24 балы;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання (8 лягчэйшых пытанняў – па 3 балы, 8 найбольш складаных – па 5 балаў, астатнія 8 – па 4 балы); складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна на яго адказалі;
- за няправільны адказ аднімаецца чвэрць балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- максімальная колькасць балаў, якой ацэньваецца заданне конкурсу, – 120, аднак аўтары задання не прадугледжваюць яго поўнага выканання ўдзельнікамі; у заданне гульні-конкурсу ўключаны пытанні, веды пра якія не прадугледжаны школьнай праграмай;
- карыстацца даведнікамі, падручнікамі, слоўнікамі, іншымі пісьмовымі або друкаванымі матэрыяламі, электроннымі сродкамі інфармацыі і сувязі забараняецца; не дазваляецца таксама абменьвацца інфармацыяй з іншымі ўдзельнікамі і задаваць пытанні настаўніку; ручка, чарнавік, картка і заданне – гэта ўсё, што патрэбна мець удзельніку;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем і чарнавік удзельнік забірае з сабой і захоўвае іх да падвядзення канчатковых вынікаў;
- вынікі ўдзельнікаў размяшчаюцца на сайце https://bakonkurs.by/ праз 1–1,5 месяцы пасля правядзення конкурсу.

## Заданне для вучняў 2 класа

**1.** Колькі слоў у скорагаворцы?

*Дудар дудару дарма дудку дае.*

**А)** 2. **Б)** 3. **В)** 4. **Г)** 5. **Д)** 6.

---

**2.** Адгадайце загадку.

*Што за паненка ў сямі сукенках?*

**А)** морква. **Б)** капуста. **В)** бульба. **Г)** рэпа. **Д)** грэчка.

---

**3.** У якім слове толькі два галосныя гукі?

**А)** мыш. **Б)** пацук. **В)** сабака. **Г)** кацяня. **Д)** кот.

---

**4.** У якой з назваў птушак ёсць літара ***і***?

**А)** салавей. **Б)** бусел. **В)** журавель. **Г)** сойка. **Д)** івалга.

**5.** Выберыце з прапанаваных слоў імя чалавека.

А) Клецк. **Б)** Клава. **В)** Магілёў. **Г)** Нёман. **Д)** Брэст.

**6.** На якім малюнку змешчана страказа?

1)  2)  3)  4) 

**А)** няма такога малюнка. **Б)** на 1. **В)** на 2. **Г)** на 3. **Д)** на 4.

**7.** Як можна назваць адным словам *валошкі, рамонкі, званочкі*?

**А)** насякомыя. **Б)** птушкі. **В)** дрэвы. **Г)** кветкі. **Д)** звяры.

**8.** Якое слова ў сказе мае два склады?

*Дзед ахвотна расказаў унукам казку.*

**А)** дзед. **Б)** ахвотна. **В)** расказаў. **Г)** унукам. **Д)** казку.

**9.** Якога слова не хапае ў народным выслоўі?

*Рабіць з … слана.*

**А)** цеста. **Б)** пластыліну. **В)** жука. **Г)** камара. **Д)** мухі.

**10.** Колькі слоў у вершаваных радках на канцы маюць літару ***м***?

*Мяккі снег лятае пухам,*
*І канца яму няма,*
*І нясе сярдзітым духам,*
*Дзікім сіверам зіма* (Якуб Колас).

**А)** 1. **Б)** 3. **В)** 5. **Г)** 7. **Д)** 9.

**11.** Вызначце ветлівы выраз, які гавораць пры развітанні.

**А)** “Добры дзень!” **Б)** “Смачна есці!” **В)** “Прашу прабачэння!”
**Г)** “Да пабачэння!” **Д)** “Сардэчна вітаем!”

**12.** Якую літару трэба паставіць у пачатак слова ***рама***, каб утварылася слова са значэннем *‘магазін, лаўка’*?

**А)** д. **Б)** б. **В)** к. **Г)** г. **Д)** п.

**13.** Суаднясіце знакі прыпынку і іх назвы, дадзеныя ў табліцы.

| | |
|---|---|
| 1) **,** | *а) працяжнік* |
| 2) **:** | *б) кропка* |
| 3) **–** | *в) коска* |
| 4) **.** | *г) двукроп’е* |

**А)** 1-а, 2-б, 3-в, 4-г. **Б)** 1-б, 2-а, 3-г, 4-в. **В)** 1-в, 2-г, 3-а, 4-б.
**Г)** 1-в, 2-б, 3-г, 4-а. **Д)** 1-г, 2-в, 3-а, 4-б.

**14.** Якую літару неабходна ўставіць на месцы пропуску ў слове *ча..ля*, каб атрымалася назва птушкі?

**А)** н. **Б)** п. **В)** ц. **Г)** б. **Д)** т.

**15.** Вызначце правільны запіс слоў у алфавітным парадку.

**А)** букет, бяроза, блакіт, бераг. **Б)** блакіт, бераг, бяроза, букет.
**В)** бяроза, букет, бераг, блакіт. **Г)** бяроза, блакіт, букет, бераг.
**Д)** бераг, блакіт, букет, бяроза.

**16.** У якім слове гукаў менш, чым літар?

*1) мора; 2) рысь; 3) ясень; 4) лік; 5) школа.*

**А)** у 1 слове. **Б)** у 2 слове. **В)** у 3 слове.
**Г)** у 4 слове. **Д)** у 5 слове.

**17.** Дадзены дзеясловы:

*1) … мычыць; 2) … іржэ; 3) … рохкае; 4) … вые.*

Падбярыце прапушчаныя словы – назвы жывёл:

*а) конь; б) воўк; в) свіння; г) карова.*

**А)** 1-а, 2-б, 3-в, 4-г. **Б)** 1-б, 2-а, 3-г, 4-в. **В)** 1-в, 2-г, 3-а, 4-б.
**Г)** 1-г, 2-в, 3-б, 4-а. **Д)** 1-г, 2-а, 3-в, 4-б.

**18.** Якое з падкрэсленых слоў “лішняе” ў сказе?

*Літары мы бачым, чуем, пішам, чытаем.*

**А)** няма “лішняга” слова. **Б)** бачым. **В)** чуем.
**Г)** пішам. **Д)** чытаем.